Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

*Ю. Ю. Захарына*

# МАСТАЦКАЕ АБЛІЧЧА БЕЛАРУСКАЙ АРХІТЭКТУРЫ 70—90-х гг. XX ст.

*Манаграфія*

1645506

Бібліятэка
БДПУ імя М Танка

Мінск 2004

УДК 72(476)
ББК 85.11(4Беи)
338

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

*Навуковы рэдактар* А. І. Лакотка, доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры, прафесар

*Рэцэнзенты:* В. М. Аладаў, доктар архітэктуры, прафесар, прэзідэнт Беларускай акадэміі архітэктуры, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ;
І. Г. Малкоў, доктар архітэктуры, прафесар, акадэмік Беларускай акадэміі архітэктуры, загадчык кафедры прамысловых і грамадзянскіх збудаванняў Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ

**Захарына Ю. Ю.**
338 Мастацкае аблічча беларускай архітэктуры 70—90-х гг. XX ст.: Манагр.— Мн.: БДПУ, 2004.— 143 с.: іл.
ISBN 985-435-892-5

У манаграфіі разглядаюцца фактары і сродкі мастацкай выразнасці беларускай архітэктуры 70—90-х гг. XX ст. Аналізуюцца мастацка-стылістычныя асаблівасці горадабудаўнічага развіцця, архітэктуры грамадскіх, культавых, прамысловых і жылых будынкаў Беларусі адзначанага перыяду.

Адрасавана мастацтвазнаўцам, культуролагам, архітэктарам, а таксама ўсім, хто цікавіцца пытаннямі сучаснага горадабудаўніцтва і архітэктуры.

**УДК 72(476)**
**ББК 85.11(4Беи)**

ISBN 985-435-892-5

© Ю. Ю. Захарына, 2004
© ВВЦ БДПУ, 2004

# УВОДЗІНЫ

Архітэктура — гэта эстэтычна арганізаванае асяроддзе жыццядзейнасці чалавека. На сучасным этапе развіцця будаўнічай культуры важную ролю адыгрывае вобразны пачатак у творах беларускай архітэктуры, што дазваляе больш глыбока зразумець каштоўнасную сутнасць архітэктурнага аб'екта, выявіць значэнне яго асобных элементаў. Выразнасць архітэктурнага твора абумоўлена выкарыстаннем розных кампазіцыйных прыёмаў. У адным выпадку яна дасягаецца за кошт размяшчэння частак будынка ва ўзаемнай гармоніі ці наўмыснай дысгармоніі, у другім — за кошт маштабнасці, адпаведнай чалавеку ці свядома гіпертрафіраванай і г. д. Прынцып, які ляжыць у аснове арганізацыі архітэктурнага вобраза, з'яўляецца эстэтычным, аднак, як і пры вырашэнні любой эстэтычнай праблемы, знешні выгляд будынка павінен адлюстроўваць яго функцыю і прызначэнне. Пры стварэнні пабудовы архітэктар улічвае ўсю сукупнасць выразных сродкаў — кампазіцыю, тэктоніку, маштаб, прапорцыі, рытм, пластыку аб'ёмаў, фактуру і колер матэрыялаў, сінтэз мастацтваў і інш. Дабіваючыся выразнасці, аўтар мастацкага твора наперад разлічвае на пэўнае эстэтычнае ўспрыманне.

Твор дойлідства ўяўляе арганізаваную сістэму канструкцыйных, архітэктурна-мастацкіх і дэкаратыўных элементаў, якія падпарадкоўваюцца агульнай ідэі, мастацка-вобразнай задуме аўтара. Мастацка-стылістычныя асаблівасці твора архітэктуры выступаюць важным элементам гэтай сістэмы, узаемадзейнічаюць з іншымі элементамі, што прыводзіць да вобразнага ўзбагачэння, мастацкай насычанасці архітэктурнага аб'екта. Сродкі мастацкай выразнасці набываюць значнасць у вырашэнні дэкаратыўна-стылістычнай арганізацыі твора архітэктуры, рэалізацыі эстэтычнай функцыі дойлідства.

Спецыфічныя рысы архітэктурнага твора, яго функцыянальныя, стылістычныя асаблівасці, вобразная напоўненасць выяўляюцца ў кожным выпадку па-рознаму. Да элементаў выразнасці, якія ўдзельнічаюць у фарміраванні архітэктурна-мастацкай кампазіцыі, можна аднесці арганізацыю горадабудаўнічай тэрыторыі з улікам скпаўшыхся прыродна-ландшафтных асаблівасцей і, безумоўна, рэльефу; гібкасць і дынамічнасць ствараемых архітэктурных аб'ектаў; маштаб, рытм, прапорцыі пабудоў; канструкцыйныя асаблівасці і магчымасці выкарыстання традыцыйных і сучасных матэрыялаў; элементы фасадаў — лоджыі, балконы, эркеры, вокны і г. д.; дэкаратыўныя элементы, якія маюць і функцыянальнае прызначэнне,— капоны, пілястры, нішы, аркі і інш.; каларыстычнае вырашэнне. Мастацка-стылістычная выразнасць ствараемых архітэктурных твораў залежыць ад вобразнай задумы архітэктара.

Фарміраванне архітэктурна-мастацкіх кампазіцый абумоўлена шэрагам фактараў. У горадабудаўніцтве найбольш істотнымі фактарамі, уплываючымі на мастацкую выразнасць, з'яўляюцца прыродна-ландшафтны, гісторыка-архітэктурны, сістэма камунікацый.

Прыродна-ландшафтны фактар непасрэдна звязаны з улікам рэльефных асаблівасцей, наяўнасцю водна-зялёнай прасторы і лясных масіваў. Існуючыя прыродна-ландшафтныя ўмовы робяць значны ўплыў на выбар прынцыпаў арганізацыі забудовы і добраўпарадкавання тэрыторыі.

Факт захавання або змянення архітэктуры гістарычна склаўшыхся раёнаў шляхам уключэння новых аб'ектаў дойлідства ці яе мадэрнізацыі дазваляе вылучыць асобна гісторыка-архітэктурны фактар. Улік яго ў значнай ступені ўплывае на фарміраванне стылістычных асаблівасцей забудовы.

З улікам сістэмы камунікацый утвараецца тая ці іншая структура планіроўкі гарадоў у цэлым (рэгулярная, радыяльная, радыяльна-кальцавая) і асобных раёнаў у прыватнасці.

У галіне грамадскіх, культавых, прамысловых і вытворчых, а таксама жылых будынкаў гарадоў і сельскіх населеных пунктаў Беларусі 70—90-х гг. да фактараў, уплываючых на мастацкую выразнасць, можна аднесці функцыянальны, канструкцыйна-тэхнічны, эмацыянальна-эстэтычны.

Функцыянальны фактар уплывае на выбар тыпаў узводзімых будынкаў, маштабу, прапорцый, арганізацыі аб'ёмна-прасторавых кампазіцый і ўнутранай планіроўкі. Канструкцыйна-тэхнічны фактар найперш звязаны з індустрыяльным будаўніцтвам. Новыя прагрэсіўныя канструкцыі і матэрыялы, якія ўжываюцца пры ўзвядзенні пабудоў грамадскага прызначэння і жылля, дазваляюць ствараць яскравыя архітэктурна-мастацкія вобразы. Аднак пошук шляхоў удасканалення функцыянальных і эстэтычных якасцей дойлідства цесна звязаны і з пошукам магчымасцей ужывання новых прагрэсіўных канструкцый, якія ў найбольшай ступені адпавядаюць іх тэхнічным патрабаванням. Эмацыянальна-эстэтычны фактар, непасрэдна звязаны з дэкаратыўным аздабленнем будынкаў, спрыяе дасягненню адзінства мастацкай задумы.

На ўзроўні грамадскай свядомасці пры фарміраванні архітэктурнай кампазіцыі значнасць набываюць рэгіянальны, гістарычны і нацыянальны фактары.

Выразнасць з'яўляецца спецыфічнай асаблівасцю твораў мастацтва, адной з галоўных характарыстык мастацкай формы. Яна ўласціва ўсім відам мастацтва, аднак праяўляецца ў іх па-рознаму. Архітэктура імкнецца зафіксаваць пэўныя ўласцівасці аб'ектаў, з'явы і факты рэчаіснасці, па магчымасці не дэфармуючы іх.

Важная роля з пункту гледжання мастацка-стылістычнай выразнасці належыць формаўтваральнаму значэнню дойлідства. Этап формаўтварэння ў станаўленні твора архітэктуры — гэта эстэтычная дзейнасць, якая заключаецца ў дасягненні універсальнага, дасканалага ўзаемадзеяння тыпаў кампазіцыі і ўласцівых ім утылітарных структур. Архітэктура ўспрымаецца ў сінтэзе з іншымі відамі мастацтва і мастацкай творчасці. У гэтым сэнсе яна выступае базай для сінтэзу мастацтваў — пераважна манументальна-выяўленчага і дэкаратыўнага.

У архітэктуры вялікае значэнне мае эстэтычная функцыя. Мастацкія вобразы архітэктуры робяць эмацыянальнае ўздзеянне на свядомасць людзей. Важная роля пры гэтым належыць дэкаратыўным і стылістычным асаблівасцям.

Праблема стылю ў мастацтвазнаўстве займае адно з галоўных месц. Асабліва ярка праблема стылю паўстала ў XX ст., што было звязана з адмаўленнем эклектыкі XIX ст. і станаўленнем спачатку стылю мадэрн, а затым новага мастацка-эстэтычнага руху мадэрнізм. Характэрнымі рысамі апошняга сталі дынамізм, імкненне да руху, стылістычнае наватарства і г. д. У архітэктуры мадэрнізм вырашыў супярэчнасць паміж якасцю новых матэрыялаў (металу, шкла, жалезабетону) і былой архітэктурнай эклектыкай. У галіне горадабудаўніцтва мадэрнізм змог вырашыць канфлікт паміж структурай старога горада і

новымі сродкамі транспарту і камунікацый. У перыяд высокіх дэмаграфічных тэмпаў развіцця чалавецтва шляхам індустрыялізацыі і павышэння тэмпаў будаўніцтва вырашалася жыллёвая праблема.

Як своеасаблівы працяг авангардысцкіх эксперыментаў у другой палове XX ст. узнікае постмадэрнізм — навейшая архітэктурна-мастацкая плынь, якая нясе ў сабе як адмаўленне пануючай «сучаснай», «новай» архітэктуры з яе аднастайнасцю, манатоннасцю, так і стадыяльную, часовую ўпэўненасць у тым, што прыйшла ёй на змену. Тым не менш постмадэрнізм мае даволі дакладную характарыстыку. У постмадэрнісцкім мастацтве можна вылучыць спалучэнне двух пачаткаў — рэалістычнага і авангарднага. Першы звязаны з працягам нацыянальных традыцый, якія абазначыліся ў мастацтве ў час панавання мадэрна. Другі вылучае ў якасці галоўнага творчага прынцыпу плюралізм, «гульню» стыляў, мастацтва «цытавання», рэтраспектывізм. З архітэктурай постмадэрнізму звязаны паняцці мнагазначнасці, разнастайнасці, асацыятыўнасці, іранічнасці, двухсэнсавасці, сімвалічнасці, гістарызму, пластычнасці, маляўнічасці, арнаментальнасці. Аднак гістарызм постмадэрнісцкай архітэктуры далёкі ад гістарычнасці класіцызму і нават эклектыкі XIX ст., хоць постмадэрнізму ўласцівы розныя адценні гістарызму, укпючаючы прамую рэтраспекцыю, узмацненне рэгіянальных тэндэнцый, метафарычнасць архітэктуры, мнагазначнасць прасторавых вырашэнняў, праграмны эклектызм.

Постмадэрнізм імкнецца пераадолець элітарнасць «новай архітэктуры» не шляхам спрашчэння, а пашырэння мовы архітэктуры ў розных напрамках, перш за ўсё ў бок засваення мясцовых асаблівасцей, нацыянальных традыцый. Постмадэрнісцкая прастора з'яўляецца гістарычна спецыфічнай. Яна ўзыходзіць каранямі да традыцый. Аднак нярэдка традыцыйнае пераўтвараецца ў традыцыяналізм, які ўключае і эклектычныя элементы. У выніку нараджаецца адна з гістарычна магчымых стылістычных форм адлюстравання эстэтычных адносін да сваёй эпохі — так званая «бесстылёвасць».

Значны адбітак на беларускую архітэктуру XX ст. наклалі савецкія традыцыі. Савецкі функцыяналізм 1917—1932 гг. працягваў традыцыі наватарскіх плыней пачатку стагоддзя. У гэты час узнаўленне класічных форм і прапорцый было прызнана недапушчальным і несучасным, таму што супярэчыла як новай ідэалогіі, так і новым матэрыялам і тэхналогіям, якія неслі сваю мастацкую форму. Барацьба напрамкаў, якія аформіліся ў творчыя групоўкі, здзяйснялася ў даволі кароткі прамежак часу і завяршылася к 1929 г. станаўленнем канструктывізму. Канструктывісты лічылі, што новае мастацтва павінна стаць вытворчым, ствараючым матэрыяльнае асяроддзе. Прастата форм, пануючая ў архітэктуры гэтых часоў, атаясамлівалася з дэмакратычнасцю.

На змену канструктывізму прыйшоў новы напрамак — савецкі неакласіцызм, які панаваў да сярэдзіны 50-х гг. Архітэктурная практыка гэтых часоў адрозніваецца стылістычнай разнастайнасцю. Сярод праектаў, выкананых у рознай манеры, былі і падкрэслена стылізатарскія, і эклектычныя; адначасова ўзводзіліся пабудовы і ў ярка выяўленай канструктывісцкай стылістыцы.

Тэндэнцыя да спрашчэння форм у архітэктуры назіраецца ў перыяд з 1954 г. па 1960-я гг., у часы звароту да функцыяналізму. Мастацкая выразнасць архітэктуры дасягаецца дзякуючы рытмічнай будове, сістэме аконных праёмаў і балконаў у адных збудаваннях, увядзенню лоджый у другіх, што не змяняла

агульнай простай формы будынка. Форма збудаванняў стала больш лёгкай і сучаснай.

Ужо напрыканцы перыяду павышаецца грамадскі інтарэс да эстэтычных даследаванняў, значнае месца сярод якіх займае праблема стылю. Ва ўсіх сферах мастацкай творчасці адзначаецца павышаная ўвага да гісторыі культуры, імкненне знайсці новыя вырашэнні і ўзбагаціць імі мастацкае асяроддзе. У стылістычных адносінах архітэктура гэтага часу, як і іншыя віды мастацтва (напрыклад, графіка), развіваецца ў савецкіх традыцыях, не ігнаруючы пры гэтым народныя.

У 80-х гг. у мастацтве назіраецца тэндэнцыя да спалучэння гістарычнага і новага. Творы гэтага перыяду адрозніваюцца разнастайнасцю і глыбінёй творчых пошукаў, імкненнем пашырыць звыклыя межы сродкамі мастацкай выразнасці. Па-новаму ўспрымаюцца традыцыі мінулага, глыбей асэнсоўваецца сучаснасць. Асабліва інтэнсіўным гэты працэс быў у канцы 80 — 90-х гг., што звязана з актывізацыяй руху за нацыянальна-культурнае адраджэнне.

Сучасная архітэктура Беларусі ў межах постсавецкай прасторы існуе як працяг і адначасова адмаўленне яе традыцый. У выніку зняцця «ідэалагічнага вета» на стыль, пануючага ў савецкія часы, галоўным адрозненнем беларускай архітэктуры 80—90-х гг., зведаўшай уплыў постмадэрнізму, стала імкненне працаваць «у стылях». Стылістычная неакрэсленасць нясе на сабе адбітак грамадскай ментальнасці, сфарміраванай савецкай культурай і традыцыйнай. Пры гэтым у стылістычных адносінах існуе пэўнае жанравае размежаванне. У архітэктуры офісаў і масавага жылля, узводзімага індустрыяльным метадам, захаваў свае пазіцыі мадэрнізм. Праявы постмадэрнізму ў большай ступені знайшлі адлюстраванне ў грамадскай архітэктуры, культавым дойлідстве і індывідуальным жыллёвым будаўніцтве.

Рысамі аптымістычных і сур'ёзных адносін да грамадскага значэння архітэктуры адзначаны пошукі шляхоў пераемнага выкарыстання лепшых дасягненняў архітэктуры мінулага. У аснове гэтых пошукаў заўсёды ляжаў прынцып, што сферай пераемнасці павінны быць унутраныя істотныя рысы дойлідства, сугучныя сучаснасці.

Найбольш істотна тэндэнцыя да пераасэнсавання і выкарыстання рыс гістарычных мастацкіх стыляў у беларускім дойлідстве выявілася ў горадабудаўніцтве, архітэктуры жылых, грамадскіх, культавых і прамысловых будынкаў.

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ . . . 3
Глава 1. ГОРАДАБУДАЎНІЦТВА . . . 7
*1.1. Фактары мастацкай выразнасці ў горадабудаўніцтве 70-х гг.* . . . 7
*1.2. Сродкі мастацкай выразнасці ў забудове гарадоў 80-х гг.* . . . 15
*1.3. Фарміраванне гарадскога асяроддзя ў 90-х гг.* . . . 24
Глава 2. АРХІТЭКТУРА ГРАМАДСКІХ БУДЫНКАЎ І ПРАМЫСЛОВЫХ ЗБУДАВАННЯЎ . . . 31
*2.1. Мастацкая выразнасць кампазіцый грамадскіх і прамысловых будынкаў 70-х гг.* . . . 31
*2.2. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя грамадскіх будынкаў 80-х гг.* . . . 45
*2.3. Рэтраспектыўная тэндэнцыя ў грамадскім і культавым дойлідстве 90-х гг.* . . . 59
Глава 3. АРХІТЭКТУРА ЖЫЛЫХ БУДЫНКАЎ . . . 71
*3.1. Дынаміка сілуэта ў кампазіцыі жылых будынкаў 70-х гг.* . . . 71
*3.2. Сродкі мастацкай выразнасці ў жыллёвым будаўніцтве 80-х гг.* . . . 77
*3.3. Гістарычныя рысы ў архітэктуры жылых будынкаў 90-х гг.* . . . 83
Глава 4. СЕЛЬСКАЯ АРХІТЭКТУРА . . . 91
*4.1. Планіроўка і забудова сельскіх населеных пунктаў* . . . 91
*4.2. Грамадскія будынкі і прамысловыя збудаванні* . . . 106
*4.3. Жылыя будынкі* . . . 116
ЗАКЛЮЧЭННЕ . . . 123
ЛІТАРАТУРА . . . 126
СЛОЎНІК ТЭРМІНАЎ . . . 128
ДАДАТАК . . . 137